# СЕКЦЫЯ 4
# ЛІТАРАТУРА Ў РЭЦЭПЦЫІ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ

## Гукавая паэзія Алеся Сьнега як эксперыментальная з’ява ў сучаснай літаратуры

*А. У. Вінаварава*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – І. М. Гоўзіч, канд. філалаг. навук, дац.*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца адметнасць “гукавой паэзіі” А. Сьнега, вызначаюцца асноўныя рытмаваральныя кампаненты, іх спецыфіка і мастацкая функцыя.

**Ключавыя словы:** паэтычны эксперымент; гукавая паэзія; гукапіс; інтанацыя; мастацкі вобраз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адной з цікавых эксперыментальных з’яў у сучаснай літаратуры можна лічыць “уяўную” гукавую паэзію Алеся Сьнега, якая разлічана на слыхавое ўспрыманне вершаў “шэптам” і эмацыянальнае ўслухоўванне ў іх змест.

Характэрнай асаблівасцю творчасці А. Сьнега становіцца выяўленне ў рытмаваральных кампанентах набліжанасці да музычнай формы верша, створанай не толькі рытмам і рыфмай, але ў многіх выпадках паўторам аднолькавых гукаў, аўтарскім кампазіцыйным падзелам (пераносам) слоў, вымаўленнем, аб’ёмам страфы, гэта значыць, аб’ектыўнай акустычнай асновай інтанацыі, якая звязана з выяўленнем думак і эмоцый у гуку:

*І я,*
*І ты,*
*І тысячы*
*Іншых.*
*Парушаны*
*Рытм.*
*Кава і вішні.*
*Лета*
*Без нас.*
*Праз гадзіну цягнік* [3].

А. Сьнега называюць паэтам “без кнігі”, які “не робіць сабе фетышу з папяровага выдання сваёй творчасці, але даносіць яе мовай, зразумелай сучаснай моладзі” [2]. Яго

электронныя зборнікі паэзіі “НЕабыякавым”, “Сэрца ў клетку” (2007), “Калекцыя тваіх аблокаў” (2011), “Штодзённік тваіх сюжэтаў”, аўдыёвершы “Шэптам” (2013) змяшчаюцца на файлаабменніку DropMeFiles, знайсці спасылку на які можа карыстальнік сацыяльнай сеткі “Укантакце”, перайшоўшы на асабістую суполку паэта “==== Алесь Сьнег [вершы]====: вершы, выступы, вы”. Сам аўтар прызнаецца, што ён знаходзіцца ў працэсе стварэння друкаванага зборніка, аднак у нейкі момант усё ж “злавіў сябе на думцы, што важна падаваць жывыя вершы. Манера чытання, паўзы, інтанацыі – гэта цікавей і больш адгукаецца слухачам, чым проста тэкст” [1].

Паэтыка твораў маладога аўтара вылучаецца сваёй неардынарнасцю, метафарычнасцю, вобразнай асацыятыўнасцю і разам з тым – лёгкай формай верша, што адбіваецца на ім дзякуючы гукавым паўторам, падзелам на своеасаблівыя рысачкі-паўзы (-), якія аўтар вынайшаў для атаясамлівання электронных недатыкальных радкоў з жывым дэкламацыйным чытаннем:

*Ма-ам, я лячу!*
*Значыць, ты расцеш*
*Уніз, на дно, у палёце,*
*Нібы ў самалёце*
*Рукі -*
*Плаўнікі* [3].

Гукавая арганізацыя верша – неад’емная і непадзельная частка сэнсавай змястоўнасці паэтычных мініяцюр, у якіх А. Сьнег за функцыямі гукапісу перш за ўсё прыхоўвае адавочную накіраванасць слоў на ўспрыманне іх чытачамі. Такая структура вымагае і свае спецыфічныя ўзроўні, якія знаходзяцца ў цесных адносінах падпарадкавання, пэўнай іерархічнасці. Найважнейшы момант такой узаемасувязі – рытм, што фарміруе ўсякі верш і ў скончаным выглядзе ператвараецца ў метр, у якім малады паэт найчасцей не выкарыстоўвае надакучлівую слухачам традыцыйнасць:

*Неба ўсміхалася нам,*
*Калі мы забывалі словы,*
*Ідучы насустрач снам,*
*Планавалі падзеі.*
*І толькі зоркі ведалі, дзе мы*
*І што з намі нічога не стане.*
*З прыходам вясны і лістамі,*
*Адрасат якіх невядомы,*
*І мы чакалі адказаў,*
*Ламаючы паштовыя скрынкі*
*Жыцця сваіх пераказаў* [3].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паэзія А. Сьнега менш за ўсё ўкладваецца ў рамкі кананізаванага метра. Калі параўнаць рытміку некалькіх яго вершаў, то няцяжка пераканацца, што ў аснове іх гукавой арганізацыі ляжаць не метрычныя адзінкі, а іх рытмічныя аўтарскія варыяцыі. І такое стаўленне да кананізаваных рытмаў мае сваё тлумачэнне: постмадэрнісцкая рэчаіснасць ужо не трывае ў сваёй прасторы тых сродкаў, што абмяжоўваюць паэта ў творчых памкненнях:

*А ты верыш у лёс?*
*Бачыш пялёс-ткі*
*Тваёй рукі,*
*Пальцы –*
*Гэта промні сонца* [3].

Нетрадыцыйная паэтычная арганізацыя, якую абірае паэт для некаторых вершаў, набывае кантэкстуальную сінтаксічна-сэнсавую незавершанасць, дзякуючы форме, у якую ўвабраны радкі. У зімовай дарожнай электроннай кнізе вершаў “Штодзённік тваіх сюжэтаў” (2013) аўтар цалкам апраўдвае ўдала прыдуманую “гульню”, што дапамагае ўзмацніць мілагучнасць і сэнсавую выразнасць паэтыкі: “У многіх вершаў няма знакаў прыпынкаў. І так трэба. І так важна” [3]:

*не пішу*
*пару месяцаў*
*цішыні*
*фільтры*
*паэтаў*
*фільмы*
*гукі і*
*рытмы*
*біты*
*на*
*рыфмы*
*гітарныя*
*рыфы*
*і мы*
*эм*
*ы* [3].

Падбіраючы неабходныя для сітуацыі словы, падпарадкоўваючы іх своеасаблівым рытмічным варыяцыям, змацоўваючы радкі поўнай рыфмай, паэт імкнецца пераадолець унутранае супрацьстаянне ящчэ недакладнага моўнага матэрыялу – там, дзе гэтая схема не спрацоўвае, карыстаецца эксперыментам:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*З ночы ў ранак*
*Без перасадак,*
*Цябе трымаючы*
*За кончыкі*
*Пальцаў,*
*Мінаючы*
*Дробныя зоры*
*Ў танцах.*
*У небе начным*
*Планет беспарадак* [3].

У шматлікіх вершах паэта як тыповае назіраецца і ўзаемадзеянне строф – часцей за ўсё прыватныя яго думкі і пачуцці выказваюцца аўтаномна ў межах страфы, што ў сваю чаргу падтрымліваецца гукапісам і адбіваецца на характары вымаўлення:

*Мае вершы ты вывучаеш,*
*Каб мяне здзівіць.*
*Шукаеш у маіх вершах*
*Падвохі,*
*Шукаеш у іх*
*Намёкі,*
*Шукаеш*
*Крокі,*
*Якія я*
*Павінен зрабіць*
*У твой бок!*
*Але ты іх не знаходзіш:*
*Можа, іх і няма,*
*Можа, глыбока хаваю,*
*Можа, таксама я*
*Ад цябе нешта чакаю* [3].

“Ты перарасцеш гэтыя каханні і будзеш пісаць пра могілкі – як Жыбуль” [2], – аднойчы паведамілі А. Сьнегу. Прымаючы пад увагу такія меркаванні, ён дагэтуль лічыць найгалоўнейшым рухавіком сваёй паэзіі і надзвычай важным аспектам уласнага жыцця каханне, якое рэгулюе і дазваляе маладосці адлюстроўваць магчымыя палярнасці любоўных перажыванняў мужчыны і жанчыны пры дапамозе гукавых паэтычных сродкаў: фанетычнага гучання слоў, алітэрацыі, асанансу, падзелу сінтаксічных адзінак на паўзы (у графічным выглядзе (-) аўтарскіх рысачак), гукапісу, арыгінальнага рытму. Выразнасць паэтычным творам надае і аўтарская

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

інтанацыя, якая ў вершах гукавога складу адыгрывае найважнейшую ролю ва ўспрыманні сэнсавых структурных частак верша: А. Сьнег неаднаразова папярэджвае чытачоў аб тым, што вершы павінны вымаўляцца “шэптам” – толькі так ствараюцца адпаведныя двухсэнсовасці закладзенага мыслення і атмасфера гарманічнага суіснавання ў рэальным, а таксама, створаным гукавой абалонкаю верша, ірацыянальным свеце.

### Літаратура


1. Дусь, Г. Парушаны рытм [Электронны рэсурс] / Г. Дусь. – Рэжым доступу: http://babruysk.by/ales-sneg-u-babrujsku-znikae-nefarmalnaya-kultura/. – Дата доступу: 18.03.2019.
2. Кіркевіч, А. Yёsць! Алесь Снег: “Я – вінцік у рухавіку беларускай культуры” [Электронны рэсурс] / А. Кіркевіч. – Рэжым доступу: http://budzma.by/news/yyosc-alyes-snyeh-ya-vincik-u-rukhaviku-byelaruskay-kultury.html. – Дата доступу: 18.03.2019.
3. Сьнег, А. Вершы [Электронны рэсурс] / А. Сьнег. – Рэжым доступу: https://vk.com/-snieg. – Дата доступу: 18.03.2019.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Рэпрэзентацыя праблемы “бацькі і дзеці” ў аповесці У. Ліпскага “Споведзь сына”


*Г. А. Лукашэвіч*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. В. Заяц, канд. філалаг. навук, дац.*



**Анатацыя.** На матэрыяле аповесці У. Ліпскага “Споведзь сына” даследуецца спецыфіка раскрыцця праблемы “бацькі і дзеці”. Паказваецца адметнасць пісьменніцкага почырку У. Ліпскага.



**Ключавыя словы:** У. Ліпскі; праблема “бацькі і дзеці”; сям’я; аповесць.


Беларускі пісьменнік Уладзімір Ліпскі вядомы найперш як аўтар, творчасць якога прызначана дзіцячай аўдыторыі. Яго кнігі “Сонца над галавой”, “Уліпкі”, “Мілаградскі конік”, “Споведзь сына” і іншыя вызначаюцца простай і даступнай мовай, шчырасцю і цеплынёй пачуццяў, глыбынёй думкі.